# ЭЛЕКТРОННЫЯ БІБЛІЯТЭКІ РАСІІ І БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМЫ ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ

*А.А. Кароткіна*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У XXI стагоддзі грамадства пераходзіць на працу і наогул многія аспекты жыцця ў электронным фармаце. Сацыяльныя інстытуты або змяняюцца або страчваюць сваю актуальнасць. Задача бібліятэк - захаваць пазіцыі сацыяльна значнага інстытута ў інфармацыйным грамадстве. Пандэмія COVID-19 стала своеасаблівым штуршком для паскоранага развіцця інфарматызацыі, перахода у дыстанцыйны, віртуальны фармат. І на жаль, складана сказаць, што бібліятэкі былі поўнасцю да гэтага гатовы.

Мэтаю даследвання з'яўляецца вывучэнне асаблівасцяў электронных бібліятэк і накірункаў іх прававога рэгулявання ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

**Матэрыял і метады.** Даследванне грунтуецца на вывучэнні прац бібліятэказнаўцаў і юрыстаў-правазнаўцаў па пытаннях электронных бібліятэк, а таксама сістэмы нарматыўных прававых актаў, што рэгулююць дзейнасць электронных бібліятэк.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У 2011 г. B. Sullivan выказаўся, што у выніку эвалюцыі пошукавых сістэм і з'яўлення інфармацыйных носьбітаў "акадэмічная бібліятэка памерла". Ён сцвярджаў, што гэта сімвалізуе прагрэс і наступны крок у эвалюцыі інфармацыі. Але жыццё акадэмічнай бібліятэкі можа быць выратавана, калі новае пакаленне бібліятэкараў не будзе кіравацца састарэлымі тэхналогіямі, а знойдзе новы шлях у будучыню [14].

Новым накірункам дзейнасці бібліятэк стала дыстанцыйнае абслугоўванне. У тэрміналагічным слоўніку "Бібліятэчная справа" яно вызначаецца як абслугоўванне карыстальнікаў, якое ажыццяўляецца інфармацыйным цэнтрам (бібліятэкай) па каналах сувязі [2, с. 36].

Найбольш запатрабаванай формай дыстанцыйнага абслугоўвання ў карыстальнікаў з'яўляюцца электронныя бібліятэкі з магчымасцю чытаць і спампоўваць для ўласнага карыстання дакументы ў электронных фарматах.

Бібліятэказнаўцы А. Б. Антапольскі і Т. В. Майстровіч у якасці электроннай бібліятэкі разглядаюць інфармацыйную сістэму, што змяшчае ўпарадкаваны фонд электронных дакументаў, які фарміруецца ў адпаведнасці з заданымі крытэрыямі і прызначаны для грамадскага карыстання, і комплекс праграмна-тэхнічных сродкаў, што рэалізуюць функцыі стварэння, выкарыстання і захавання гэтага фонда [1, с. 15].

А.А. Бачкарова, што прадстаўляе меркаванне правазнаўцаў, разглядае паняцце "электронная бібліятэка" як інфармацыйную, культурную, адукацыйную кіруемую калекцыю твораў, якіая захоўваюцца ў лічбавым фармаце і дастўпная па сетцы разам з адпаведнымі сэрвісамі фізічным і юрыдычным асобам на правах, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам [3].

Калі звярнуцца да нарматыўна-прававой базы, то на сённяшні момант у беларускім заканадаўстве, як і ў расійскім заканадаўстве не замацавана паняцце электроннай бібліятэкі. У арт. 18 Федэральнага закона РФ "Аб бібліятэчнай справе" указваецца "Национальная электронная библиотека является федеральной государственной информационной системой, которая представляет собой совокупность документов и сведений в электронной форме, которые отобраны в соответствии с методикой отбора объектов Национальной электронной библиотеки, утверждаемой Правительством Российской Федерации, и доступ к которым предоставляется пользователям Национальной электронной библиотеки, в том числе с использованием информационно-телекоммуникационной сети "Интернет"" [8].

Стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі было вызначана ў пастанове Урада РФ ад 20 лютага 2019 г. № 169 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб федэральнай дзяржаўнай інфармацыйнай сістэме "Нацыянальная электронная бібліятэка" і методыкі адбору аб'ектаў Нацыянальнай электроннай бібліятэкі" [10].

Паводле ФЗ "Аб бібліятэчнай справе" Нацыянальная электронная бібліятэка (НЭБ) ажыццяўляе натупныя функцыі:

- стварэнне і выкарыстанне аб'ектаў НЭБ у адпаведнасці з патрабаваннямі ГК РФ;
- улік і захаванне аб'ектаў НЭБ;



Репозиторий ВГУ

- забеспячэнне доступу карыстальнікаў НЭБ да аб'ектаў НЭБ у адпаведнасці з заканадаўствам РФ і Палажэннем аб НЭБ.

Аб'ектамі НЭБ з'яўляюцца створаныя ў электроннай форме копіі друкаваных выданняў, электронных выданняў, неапублікаваных дакументаў, у тым ліку дысертацый, іншых дакументаў, што прадстаўляюцца ў якасці абавязковага экзэмпляра дакументаў, кніжных помнікаў.

Акрамя таго, у РФ дзейнічае нацыянальны праект "Культура", мэтавымі паказчыкамі якога з'яўляецца павелічэнне зваротаў да лічбавых рэсурсаў у галіне культуры ў пяць разоў да 2024 г. Павінны быць створаны 660 мадэльных бібліятэк – інтэлектуальных цэнтраў з высокахуткасным доступам да Інтэрнэт, доступам да айчынных інфармацыйных рэсурсаў навуковага і мастацкага зместу, да электронных калекцый перыядычнага друку [4].

Як ужо адзначалася, у беларускім заканадаўстве таксама няма дакладнага вызначэння паняцця "электронная бібліятэка". У Стратэгіі развіцця інфарматызацыі ў Рэспубліцы Беларусь на 2016-2022 гг. толькі адзначаецца як перспектыўны накірунак развіццё сістэмы электронных бібліятэк і фарміраванне на іх аснове Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь [12].

У Беларусі ў дзяржаўнай праграме "Культура Беларуси" на 2016-2020 гг. указана, што доўгатэрміновым праектам з'яўляецца стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі, карпаратыўнай службы электроннай дастаўкі дакументаў на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі [9]. Зараз на 2021-2025 гг. таксама запланавана рэалізацыя праграмы "Культура Беларусі".

У Стратэгіі развіцця інфарматызацыі ў Рэспубліцы Беларусь на 2016-2022 гг., адзначана роль навуковых рэпазіторыяў вышэйшых навучальных устаноў. Зараз інстытуцыянальныя рэпазіторыі з'яўляюцца запатрабаванай формай у карыстальнікаў. Даследчыкі Я. Л. Шрайберг і А. І. Зямскоў вызначаюць інстытуцыянальны рэпазіторый як набор сэрвісаў, якія універсітэт прапаноўвае членам сваёй супольнасці, па кіраванню і распаўсюджванню лічбавых матэрыялаў, створаных у даннай арганізацыі [13, с. 68.].

Беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы і іх бібліятэкі з 2009 г. ствараюць навуковыя рэпазіторыі. Першай стала Навуковая бібліятэка БДУ. Зараз большасць ВНУ Беларусі маюць навуковыя рэпазіторыі, пошук па якіх магчымы па адрасе: **https://library.bntu.by/oa#gsc.tab=0.**

Як адзначае у сваей публікацыі Л. М. Пісарэнка, "Электронная бібліятэка ВДУ імя П. М. Машэрава" была зарэгістравана у рэестры рэпазіторыяў у красавіку 2014 г. Яна заняла 9 пазіцыю сярод рэпазіторыяў беларускіх ВНУ і 344 месца ў міравым рэйтынгу, складзеным Ranking Web of Repositories [11, с. 36]. Зараз наш навуковы рэпазіторый займае 4 месца ў Беларусі і 168 у свеце.

Навуковыя рэпазіторыі ВНУ змяшчаюць у асноўным службовыя творы, створаныя супрацоўнікамі ў межах службовых заданняў. З іншымі аўтарамі заключаецца ліцэнзійны дагавор. Ёсць палажэнні аб навуковых рэпазіторыях. Але нельга сказаць, што ліквідаваны ўсе складанасці з асаблівасцямі прававога рэгулявання стварэння і дзейнасці рэпазіторыяў.

Калі разглядаць меркаванні правазнаўцаў і бібліятэказнаўцаў аб электронных бібліятэках, то можна адначыць наступныя накірункі. Напрыклад В. А. Каляцін прапануе электронным бібліятэкам выкарыстоўваць электронныя дакументы так, як выкарыстоўваюць традыцыйныя дакументы звычайныя бібліятэкі, пры ўмовах, што будуць прымацца тэхнічныя меры, якія дазволяць кантраляваць выкарыстанне гэтага дакумента. У падтрымку электронных бібліятэк выказваецца Г. Б. Віслы, прапануючы прадставіць права бібліятэкам Расіі без дазволу праваўладальніка ў выглядзе пісьмовага дагавора рабіць лічбавыя копіі твора праз тры гады пасля яго апублікавання [6].

Ю. П. Мяленцьева таксама прапануе пераглядзець асобныя пазіцыі аўтарскага права ў дачыненні да бібліятэк як некамерцыйных арганізацый, зрабіўшы законным доступ да інфармацыйных рэсурсаў [7].

Правазнаўца Д. В. Іванова звяртае ўвагу на неабходнасць перагляду закона Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве. Зараз электронныя бібліятэкі могуць свабодна карыстацца толькі творамі, што з'яляюцца грамадскім здабыткам або выключаны з ахоўваемых аб'ектаў. Карыстальнікі могуць працаваць з электроннымі дакументамі толька ў памяшканнях бібліятэк [5]. Гэта абмяжоўвае права карыстальнікаў на доступ да інфармацыі.



Репозиторий ВГУ

**Заключэнне.** Сёння ніхто не можа аспрэчваць, што разам с пераходам грамадства ў лічбавы фармат, электронныя бібліятэкі з'яўляюцца вельмі запатрабаванымі. Усе больш карыстальнікаў для задавальнення сваіх інфармацыйных патрэб звяртаюцца менавіта да іх. Але каб больш якасна задавальняць інфармацыйныя патрэбы грамадства, іх дзейнасць павінна быць урэгулявана нормамі права, каб не ўзнікала складанасцяў з праваўладальнікамі твораў. Неабходна пераглядзець нормы заканадаўства аб аўтарскім праве і распрацаваць дэталёва нормы аб прававым палажэнні электронных бібліятэк, у тым ліку навуковых рэпазіторыяў у Рэспубліцы Беларусь.


1. Антопольский, А. Б. Электронные библиотеки : принципы создания : науч.-метод. пособие / А. Б. Антопольский, Т. В. Майстрович. – Москва : Либерея-Бибинформ, 2007. – 285 с.
2. Библиотечное дело : терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – 3-е изд., перераб. и доп. – Москва : РГБ, 1997. – 168 с.
3. Бочкарева, О. А. Электронные библиотеки и право / О. А. Бочкарева // Право и экономика. – 2012. – № 10. – Режим доступа: http://base.garant.ru/57791338/. – Дата доступа: 26.01.2021.
4. Гусева, Е. Н. Национальный проект «Культура» в части создания модельных муниципальных библиотек / Е. Н. Гусева // Университетская книга [Электронный ресурс]. - Режим доступа: http://www.unkniga.ru/ostraya-tema/9474-nacionalniy-proekt-kultura-v-chasti-sozdaniya-munitsipalnyh-bibliotek.html. – Дата доступа: 25.01.2021.
5. Иванова, Д. В. Электронные библиотеки и авторское право : проблемы и перспективы / Д. В. Иванова. – Режим доступа: https://ilex-private.ilex.by/view-document/BECMB/24591/%D1%8D%D0%BB%D0%B5%D0%BA%D1%82%D1%80%D0%BE%D0%BD%D0%BD%D0%B0%D1%8F%20%D0%B1%D0%B8%D0%B1%D0%BB%D0%B8%D0%BE%D1%82%D0%B5%D0%BA%D0%B0?searchKey=vej6&searchPosition=3#M100001. – Дата доступа: 26.01.2021.
6. Лукьянов, Р. Л. Правовой статус электронных библиотек в Российской Федерации / Р. Л. Лукьянов // Юридическое образование и наука. – 2010. – № 3. – С. 29-31.
7. Мелентьева, Ю. П. Роль и место традиционной библиотеки в условиях цифровизации общества / Ю. П. Мелентьева // Культура: теория и практика [Электронный ресурс]. – 2019. –№ 1. –С. 8. – Режим доступа: http://theoryofculture.ru/issues/102/1197/. – Дата доступа: 25.01.2021.
8. О библиотечном деле : Федеральный Закон от 29.12.1994 г. N 78-ФЗ : с изм. на 1 мая 2019 г. – Режим доступа: http://docs.cntd.ru/document/9010022. – Дата доступа: 26.01.2021.
9. Об утверждении Государственной программы «Культура Беларуси» на 2016-2020 годы [Электронный ресурс] : Постановление Совета Министров Республики Беларусь, 4 марта 2016 г. № 180. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C21600180&p1=1. – Дата доступа: 25.01.2021
10. Об утверждении Положения о федеральной государственной информационной системе "Национальная электронная библиотека" и методики отбора объектов Национальной электронной библиотеки [Электронный ресурс] : Постановление Правительства РФ от 20.02.2019 г. N 169 в ред. от 15.09.2020. – Режим доступа: http://www.consultant.ru/document/cons_doc_LAW_318887/. – Дата доступа:: 25.01.2021.
11. Писаренко, Л. М. Институциональный репозиторий учреждения высшего образования / Л. М. Писаренко // Научные и технические библиотеки. – 2015. – № 12. – С. 35-38.
12. Стратегия развития информатизации в Республике Беларусь на 2016 - 2022 годы [Электронный ресурс] : утверждена на заседании Президиума Совета Министров от 03 ноября 2015 г. № 26 . – Режим доступа: http://webcache.googleusercontent.com/search?q=cache:9he4aCL8kRkJ:nmo.basnet.by/concept/strategia2022.php+&cd=1&hl=ru&ct=clnk&gl=by. – Дата доступа: 23.01.2021.
13. Шрайберг, Я. Л. Модели открытого доступа : история, виды, особенности, терминология / Я. Л. Шрайберг, А. И. Земсков // Научные и технические библиотеки. – 2008. – № 5. – С. 68-79.
14. Sullivan, B. T. Academic Library Autopsy Report, 2050 / B. T. Sullivan // The hronicle of higher education. – 2011. – № 2. – Mode of access: https://www.chronicle.com/article/academic-library-autopsy-report-2050/. – Date of access: 26.01.2021.


# СУБЪЕКТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЬНОЙ ВЛАСТИ С ПАРТИЦИПАТОРНЫМ ХАРАКТЕРОМ


*М.А. Козак*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Основным содержательным аспектом категории представительной власти является ее субъектный состав. Правильное определение субъектного состава позволяет определить специфику отдельного вида власти и отделить ее от других властей.

*Целью* данной статьи является обоснование выделения нового вида субъектов представительной власти.

**Материал и методы.** Научно-теоретической основой являются труды авторов, рассматривающих политологические и конституционно-правовые основы выделения субъектов власти по определенным признакам. При написании статьи был использован метод анализа. Метод анализа употреблялся совместно с методом синтеза, который позволил объединить в единое целое конституционные, правовые, политологические теоретические научные труды ученых, для достижения обозначенной цели.

Репозиторий ВГУ